# Інтэрнэт-крыніцы: Выбраныя аналітычныя інстытуты ў Беларусі

**Беларускі інстытут стратэгічных даследаванняў**

*http://belinstitute.eu*

Беларускі інстытут стратэгічных даследаванняў (BISS) з’яўляецца незалежным аналітычным цэнтрам, які размешчаны ў Мінску. BISS прапануе стратэгіі развіцця Беларусі і падтрымлівае адкрытую публічную палітыку ў краіне праз правядзенне даследаванняў, а таксама заахвочванне да дыялогу паміж экспертнай супольнасцю, грамадзянскай супольнасцю і ключавымі палітычнымі актарамі. Да ягоных публікацый належаць “Знешнепалітычны індэкс”, “Медыябарометр” і “Беларускі штогоднік”.

**Інстытут палітычных даследаванняў – Палітычная сфера**

*http://palityka.org*

Аналітычны цэнтр падрыхтоўвае аналітычныя і грамадскія аналізы. Ён таксама ладзіць розныя навуковыя ініцыятывы, выдае часопіс “Палітычная сфера” і з’яўляецца галоўным арганізатарам штогадовага Міжнароднага кангрэсу даследчыкаў Беларусі.

**Беларускі эканамічны даследчыцка-адукацыйны цэнтр (BEROC)**

*http://eng.beroc.by/*

Беларускі эканамічны даследчыцка-адукацыйны цэнтр (BEROC) з’яўляецца эканамічным аналітычным цэнтрам у Беларусі. BEROC праводзіць акадэмічныя і прыкладныя даследаванні, арганізоўвае адукацыйныя мерапрыемствы па сучаснай эканоміцы і іншыя навучальныя ініцыятывы.

**Даследчыцкі цэнтр ІПМ**

*http://eng.research.by/*

Заснаваны ў 1999 годзе, Даследчыцкі цэнтр Інстытута прыватызацыі і менеджменту з’яўляецца незалежным аналітычным цэнтрам, які спецыялізуецца на эканамічных і сацыяльных даследаваннях. Акрамя правядзення даследаванняў, цэнтр адсочвае і прагназуе эканамічную сітуацыю ў Беларусі, спрыяе прафесійнаму і грамадскаму дыялогу па развіцці нацыянальнай эканомікі.

**Ліберальны клуб**

*http://liberalclub.biz/*

Размешчаная ў Мінску, Дыскусійна-аналітычная супольнасць “Ліберальны клуб” – некамерцыйная арганізацыя, якая займаецца даследчыцкімі і адукацыйнымі праектамі. Яна ладзіць шырокі спектр круглых сталоў і канферэнцыяў у Беларусі на сацыяльныя, эканамічныя, палітычныя і культурныя тэмы.

**Цэнтр пераходных даследаванняў**

*http://transition-centre.org*

Размешчаны ў Мінску і Лондане, Цэнтр пераходных даследаванняў спрыяе лепшаму разуменню працэсаў трансфармацыі ў Беларусі і замежжы. Да ягоных флагавых ініцыятываў належаць BelarusDigest.com і “Журнал беларускіх даследаванняў”.